У Вика было два пути для конфиденциального сотрудничества перед тем как публично объявить о своей готовности открыть диалог. Первый и гораздо более сложный — это договориться сразу со всей белорусской оппозицией. Путь действительно сложный, и он потребовал бы от Вика, по меньшей мере, терпения, политической твердости и дипломатической зрелости. Политические партии Беларуси неоднородны и зачастую решают противоположные задачи. Второй путь показался Вику гораздо проще, и, что важно, именно этот путь позволял Германии говорить о своем влиянии на данный регион. Договориться с президентом Лукашенко о якобы "существенных уступках" удалось в считанные дни. И в дальнейшем Вик просто разыграл "политическую партию", выгодную именно президенту.

Фамилия Вика слишком часто мелькает сегодня на страницах белорусских газет. И, мне кажется, ничего хорошего в том нет, что немецкий гражданин, для которого проблемы Беларуси вторичны и который просто отрабатывает заработную плату, оказался вдруг негласным лидером переговорного процесса между нелегитимной властью и оппозицией.

На самом деле Вик не безобиден. Честно говоря, он чрезвычайно опасен для Беларуси именно сегодня, когда решается фундаментальный вопрос: как дальше противостоять режиму Лукашенко?

Створана камісія па праекце TACIC, накіраваным на паляпшэнне трансеўрапейскіх транспартных калідораў

Прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей Лінг падпісаў распараджэнне аб стварэнні міжведамаснай камісіі па разглядзе пытанняў, звязаных з распрацоўкай праекту TACIC "Паляпшэнне транспартных патокаў у 2-м і 9-м трансеўрапейскіх калідорах".

Калідоры N 2 (Берлін — Варшава — Мінск — Масква) і N 9, частка якога праходзіць праз гарады Кіеў — Мінск — Вільнюс, уваходзяць у лік транспартных артэрый, афіцыйна адобраных на агульнаеўрапейскіх канферэнцыях міністраў транспарту ў 1994-м і 1997 годзе ў якасці вызначаючых эканамічнае развіццё ў Цэнтральнай і Усходняй Еўропе. Праект па іх паляпшэнні будзе ажыццяўляцца ў межах Праграмы TACIC Еўрапейскай супольнасці.

Мэтай праекту з'яўляецца паляпшэнне транспартных патокаў, вызначэнне попыту на пасажырскія і грузавыя перавозкі аўта- і чыгуначным транспартам з выкарыстоўваннем камп'ютэрызаванай мадэльнай сістэмы. Ён прадугледжвае як паляпшэнне аўтамабільных дарог і чыгунак, так і ўкараненне сістэм тэлекамунікацый, інтэграваных сродкаў апрацоўкі і перадачы інфармацыі для забеспячэння транспартных патокаў у перасячэнні межаў. На першым участку калідора N 2 (Берлін — Варшава — беларуская мяжа) працы ўжо вядуцца.

Старшынёй міжведамаснай камісіі, закліканай ажыццяўляць каардынацыю дзейнасці міністэрстваў і ведамстваў краіны ў распрацоўцы гэтага праекту TACIC, прызначаны міністр транспарту і камунікацый Анатоль Лукашоў. У яе ўключаны прадстаўнікі апарата Савета Міністраў, міністэрстваў транспарту, эканомікі, унутраных спраў, Дзяржаўнага мытнага камітэта, Беларускай чыгункі, Беларускай асацыяцыі экспедытараў і інш. Увайсці ў склад гэтага рабочага органа згадзіўся і кіраўнік аддзялення Прадстаўніцтва Еўрапейскай Камісіі ў Рэспубліцы Беларусь "TACIC-офіс" спадар дэ Люзэнбергер.

Алесь КНЯЗЮК.

Працягвае падаць цана і пакупніцкі попыт на жыллё ў Мінску

Беларуская гільдыя спецыялістаў па нерухомасці паведаміла пра вынікі штоквартальнага даследавання кватэрнага рынку Мінска, якое праводзіцца Беларускім таварыствам ацэншчыкаў (БТА).

Спецыялісты канстатуюць, што падзенне цэн назіралася на працягу ўсяго першага паўгоддзя. Цана квадратнага метра агульнай плошчы знізілася ў другім квартале на 6,8 працэнта ў параўнанні з першым — з 429,1 да 400,1 умоўных адзінак.

Грунтуючыся на выніках даследавання, БТА лічыць, што далейшае падзенне цэн непазбежнае, яно будзе працягвацца на працягу некалькіх месяцаў.

У якасці асноўнай прычыны падзення цэн спецыялісты называюць зніжэнне ўзроўню жыцця насельніцтва і толькі потым — выкарыстанне дзяржаўнай жыллёвай праграмы і далявое будаўніцтва. Паколькі падзенне попыту на кватэры (за квартал яно склала 23,4 працэнта) істотна перавышае квартальнае падзенне індэксу цэн (6,8 працэнта), гэта дазваляе прагназаваць далейшае зніжэнне цэн у бліжэйшыя месяцы.

Паводле дадзеных даследаванняў, падзенне цэн на жыллё стала вялікім плюсам для пакупнікоў кватэр. Сённяшні рынак з залішняй прапановай дае магчымасць ўжо не прадаўцам, а пакупнікам дыктаваць цэны кватэр, прымушаючы першых саступаць на 10—30 працэнтаў. Аднак нават гэтыя кардынальныя крокі, на думку спецыялістаў, не здольныя падняць рынак нерухомасці да ўзроўню павышэння або хаця б некаторай стабілізацыі цэн, калі не будзе ліквідавана першапрычына — падзенне рэальных даходаў насельніцтва.

Падзенне цэн на кватэры ў Мінску, такім чынам, заканамерны факт, які адлюстроўвае агульныя тэндэнцыі эканамічнага развіцця дзяржавы, адзначаецца ў даследаванні Беларускага таварыства ацэншчыкаў.

Наталля КУЛАГІНА.

Знай наших!



С золотой медалью победителя олимпиады по математике среди учащихся средних школ, лицеев и колледжей вернулся из столицы Румынии Бухареста Иван Рожнов. Иван — воспитанник Витебского лицея №1. Талантливый юный математик в этом году закончил лицей, успешно сдал экзамены и стал студентом факультета прикладной математики БГУ.

На снимке: *Иван Рожнов — первокурсник БГУ.*

Фото Александра ХИТРОВА, БелТА.

Ліквідаваць перашкоды, якія могуць адмоўна паўплываць на тушэнне пажараў

З радыёпаведамленнем да жыхароў Гомельскай вобласці звярнуўся начальнік абласнога ўпраўлення ваенізаванай пажарнай службы Аляксандр Лужкоў. Падставай для гэтага паслужылі два пажары, якія адбыліся днямі ў высотных будынках Гомеля.

Аляксандр Лужкоў адзначыў, што хаця пажары не былі складанымі, пажарныя сутыкнуліся з цяжкасцямі іншага парадку — загрувашчанымі калідорамі і лесвічнымі пляцоўкамі, шматлікімі металічнымі дзвярамі ў кватэрах і іншымі. Галоўны пажарны вобласці заклікаў насельніцтва па магчымасці ліквідаваць гэтыя недахопы, якія ў крытычныя моманты могуць з'явіцца сур'ёзнымі перашкодамі для ратавання людзей.

Аляксандр Лужкоў падкрэсліў таксама, што 9 паверх — мяжа для пажарных, паколькі ў іх, нягледзячы на шматгадовыя просьбы, дагэтуль няма спецыяльных лесвіц, якія б дазвалялі дасягаць паверхаў, размешчаных вышэй. Адзіная на ўсю вобласць высотная лесвіца ёсць у жлобінскіх пажарных — яе падарыў Беларускі металургічны завод.

Начальнік упраўлення крытычна ацаніў пасіўнасць у вырашэнні гэтай праблемы ўлад Гомеля — горада, дзе знаходзіцца каля 100 шматпавярховых будынкаў. Больш за тое, як паказала нядаўняя праверка, толькі ў кожным другім з іх працуе сістэма супрацьдымнай абароны.

Ірына МАКАВЕЦКАЯ.

Працягваецца падзенне аб'ёму нафтаперапрацоўкі

З-за рэзкага зніжэння паставак нафты з Расіі ў Беларусі працягваецца падзенне аб'ёму нафтаперапрацоўкі. Так, з 1 па 17 жніўня ў краіне перапрацавана 383 тысячы тон нафты, што складае ўсяго 69 працэнтаў да аналагічнага леташняга перыяду. З пачатку бягучага месяца пастаўкі расійскай сыравіны на ВА "Нафтан" скараціліся на 33 працэнты, на АТ "Мазырскі НПЗ" — на 18 працэнтаў.

Асноўнай прычынай такой сітуацыі спецыялісты па-ранейшаму называюць рост цэн на нафту, якая паступае з Расіі, а таксама пагаршэнне фінансавага стану дзяржаўнага канцэрна "Белнафтахім", які знізіў аб'ёмы закупкі вуглевадароднай сыравіны з 560 тысяч тон — у лютым 1999 года да 212 тысяч — у ліпені. На працягу апошніх трох месяцаў вырасла цана расійскай нафты для беларускіх спажыўцоў: цяпер 1 тона каштуе 100 долараў ЗША замест ранейшых 40 долараў. І, паводле прагнозаў спецыялістаў, гэтая тэндэнцыя ў бліжэйшы час будзе працягвацца.

Яўген ГРУБІЧ.

Кіраўнікі ваенных ведамстваў краін СНД сустрэнуцца ў Астрахані

Як стала вядома БелаПАН, на 27 жніўня прызначана чарговае пасяджэнне Савета міністраў абароны дзяржаў-удзельніц СНД.

Месца правядзення сустрэчы кіраўнікоў ваенных ведамстваў — Астрахань (Расія) — выбрана, хутчэй за ўсё, невыпадкова: менавіта ў Астраханскай вобласці, на палігоне Ашулук, 26 жніўня завершыцца трохдзённы асноўны этап кааліцыйных вучэнняў сіл супрацьпаветранай абароны дзяржаў-удзельніц Аб'яднанай сістэмы СПА дзяржаў СНД "Баявая садружнасць-99".

Плануецца, што за ходам вучэнняў будуць назіраць міністры абароны Расіі, Беларусі, Казахстана, Кыргызстана і Арменіі. Парадак дня пасяджэння міністраў абароны пакуль удакладняецца, аднак ужо зараз вядома, што ў цэнтры іх увагі будзе шырокае кола пытанняў, якое датычацца ўмацавання ваеннага і ваенна-тэхнічнага супрацоўніцтва як у межах усёй Садружнасці, так і ў межах Дагавора аб калектыўнай бяспецы, удзельнікамі якога зараз фактычна з'яўляюцца толькі 6 з 12 краін СНД. Міністры будуць таксама праінфармаваныя аб выніках кааліцыйных вучэнняў "Баявая садружнасць-99".

Не выключана, што падчас сустрэчы прадстаўнікі Азербайджана ў чарговы раз негатыўна выкажуцца адносна ўмацавання ваеннага саюза Расіі і Арменіі, які, як лічыць афіцыйны Баку, накіраваны супраць яго. Як паведаміла азербайджанскае інфармацыйнае агенцтва ЭМ-ПІ-ЭЙ, гэтая тэма абмяркоўвалася на мінулым тыдні падчас сустрэчы выканаўчага сакратара Садружнасці Юрыя Ярава з прэзідэнтам Азербайджана Гейдарам Аліевым. Апошні, у прыватнасці, заявіў, што "ваенны саюз Расіі і Арменіі негатыўна адбіваецца на аўтарытэце СНД".

Вячаслаў БУДКЕВІЧ.

Навошта нарыхтоўваць драўніну з радыяцыяй

Нарыхтоўка драўніны ў пацярпелых ад чарнобыльскай катастрофы раёнах немэтазгодная — такое меркаванне вядомага ў краіне вучонага-лесавода, намесніка дырэктара па навуцы Інстытута лесу Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Уладзіміра Багінскага.

У гутарцы з карэспандэнтам БелаПАН ён паведаміў, што зараз вядзецца нарыхтоўка драўніны ў зонах са шчыльнасцю забруджання цэзіем-137 да 15 кюры на квадратны кіламетр. Паводле слоў вучонага, у зонах са шчыльнасцю забруджання больш за 15 кюры праводзіць падсечку лесу эканамічна нявыгадна: ствол дрэва, нарыхтаванага ў такой зоне, не можа быць выкарыстаны поўнасцю з-за радыяцыйнага забруджання абалонкі, якую давядзецца здымаць у адыходы. Акрамя таго, неабходна прадпрымаць дадатковыя, даволі дарагія захады па забеспячэнні бяспекі людзей, занятых на лесапавале і вывазе драўніны. Лясы ж у зонах забруджвання, як правіла, даволі маладыя, і спатрэбіцца прыкладна 20 гадоў, каб яны выраслі.

"На тэрыторыі Беларусі, якая не пацярпела ад наступстваў Чарнобыля, маецца дастатковая колькасць запасаў чыстага спелага лесу, таму мне ўяўляецца немэтазгодным праводзіць нарыхтоўку дзелавой драўніны ў лясных масівах, пашкоджаных радыяцыяй", — заявіў У.Багінскі. Гэтае пытанне, паводле яго сцвярджэння, будзе абмяркоўвацца падчас міжнароднай канферэнцыі маладых вучоных-лесаводаў Расіі, Украіны і Беларусі, якая пройдзе ў Гомелі 5—6 кастрычніка.

Марат ГАРАВЫ.

Брэсцкая вобласць здала дзяржаве 130 тысяч тон збожжа пры дзяржзаказе 250 тысяч

Сітуацыя са здачай збожжа дзяржаве ў Брэсцкай вобласці застаецца складанай. Некалькі дзён назад з неабходных 250 тысяч тон у лік дзяржзаказу было здана толькі каля 130 тысяч.

На зернескладах у калгасах і саўгасах вобласці знаходзіцца больш за 600 тысяч тон збожжа, аднак многія раёны не спяшаюцца разлічвацца з дзяржавай. У асноўным гэта дачыцыцца Ганцавіцкага, Драгічынскага, Столінскага, Пружанскага раёнаў.

Паводле слоў начальніка аддзела маркецінга Брэсцкага вытворчага аб'яднання хлебапрадуктаў Таісіі Алейнікавай, надзея на тое, што дзяржзаказ гаспадаркі вобласці выканаюць, усё ж ёсць, аднак гэтага збожжа ўсё роўна будзе недастаткова для таго, каб пражыць год да наступнага ўраджаю. Вобласці не хапае 200 тысяч тон фуражнага і каля 40 тысяч тон харчовага збожжа — для яго закупкі за межамі краіны спатрэбіцца каля 30 мільёнаў долараў ЗША. Таму сёння на Брэстчыне вядзецца напружаная праца па заключэнні дагавораў, якія прадугледжваюць пастаўкі збожжа па бартэры — у абмен на газавыя пліты, мэблю, бульбу, мяса і г.д. Да вырашэння гэтых пытанняў плануецца падключыць камерцыйныя банкі, дзяржаўныя і недзяржаўныя прадпрыемствы, якія маюць валюту і могуць аказаць рэальную дапамогу.

Валянціна КАЗЛОВІЧ.

На Магілёўшчыне не змаглі завяршыць уборку збожжавых і зернебабовых культур ва ўстаноўленыя тэрміны

У паўднёвых раёнах вобласці жніво, згодна з планам, павінна было завяршыцца 10 жніўня, у астатніх раёнах — 15 жніўня. Аднак, паводле звестак на 16 жніўня, чвэрць ад агульнай плошчы пасеваў збожжавых на Магілёўшчыне заставаліся няўбранымі. На гэты дзень у вобласці было ўбрана 74 працэнты збожжавых і зернебабовых культур.

Самыя высокія тэмпы ўборкі — больш за 85 працэнтаў засеяных плошчаў — былі ў гаспадарках Кіраўскага, Бабруйскага і Бялыніцкага раёнаў. Горш за ўсіх убіраюць хлеб у Мсціслаўскім, Крычаўскім, Клімавіцкім і Хоцімскім раёнах (59—53 працэнты ад планавых плошчаў). Невялікая і ўраджайнасць збожжавых — 15 ц/га ў сярэднім па вобласці. Пры гэтым толькі ў Горацкім раёне яна перавышае мяжу ў 20 ц/га, разам з тым як у Хоцімскім, Касцюковіцкім і Клімавіцкім знаходзіцца на ўзроўні 10 ц/га.

Што ж да валавай вытворчасці сельгаспрадукцыі ў Магілёўскай вобласці, то за першае паўгоддзе яна знізілася на 16,9 працэнта (у першым квартале тэмпы зніжэння складалі 9,4 працэнта пры прагнозным росце — 3,5 працэнта). Сярод асноўных прычын няўдач аграрнікаў спецыялісты называюць няякаснае правядзенне сяўбы, знос тэхнікі, стратнасць большасці сельскіх гаспадарак вобласці і, натуральна, неспрыяльныя ўмовы надвор'я.

Канстанцін УВАРАЎ.

МЗС Беларусі заклікае грамадзян краіны выконваць захады бяспекі пры наведванні Польшчы

Апошнім часам значна павялічылася колькасць выпадкаў, калі беларускія грамадзяне, якія выязджаюць у Рэспубліку Польшча, трапляюць у экстрэмальныя сітуацыі ў сувязі са стратай або крадзяжом дакументаў і грошай. Толькі ў першым паўгоддзі 1999 года беларускімі консульскімі ўстановамі ў Польшчы было выдадзена 443 пасведчанні на вяртанне ў Беларусь. Паводле інфармацыі польскага боку, на пачатак ліпеня ў месцах пазбаўлення волі і цэнтрах папярэдняга зняволення Польшчы знаходзіліся больш за 160 беларусаў.

У сувязі з гэтым МЗС Беларусі звяртае ўвагу грамадзян на неабходнасць выканання імі захадаў бяспекі пры наведванні Польшчы і, у прыватнасці, рэгіёну Беластока, а таксама выканання польскага заканадаўства па пытаннях уезду-выезду, следавання транзітам і знаходжання на тэрыторыі РП. Цяпер паміж Беларуссю і Польшчай дзейнічае пагадненне, заключанае ўрадамі СССР і ПНР 13 снежня 1979 года. У ім прадугледжваюцца выпадкі ўзаемных бязвізавых паездак грамадзян. Іншыя выпадкі прадугледжваюць спрошчаны парадак атрымання ўязных віз у дыппрадстаўніцтвах і консульскіх установах РБ у Польшчы.

Як паведаміў прэс-сакратар МЗС Беларусі Мікалай Барысевіч, для папярэджання супрацьпраўных дзеянняў у дачыненні да беларускіх грамадзян беларускімі консульскімі ўстановамі ў Беластоку, Варшаве і Гданьску падтрымліваюцца пастаянныя кантакты з польскімі праваахоўнымі органамі. Разам з тым, адзначыў ён, самі беларусы нярэдка парушаюць правілы знаходжання на тэрыторыі Польшчы. Апошнім часам сталі частымі выпадкі, калі грамадзяне РБ, маючыя сапраўдныя польскія візы або турыстычны ваўчар, выдадзены на кароткі тэрмін, не пакідаюць тэрыторыю краіны да заканчэння тэрміну іх дзеяння.

Падобныя парушэнні жорстка кантралююцца польскай паліцыяй, а пры затрыманні грамадзян, якія парушылі правілы знаходжання, польскія ўлады дэпартуюць іх з краіны і, як правіла, пазбаўляюць права на наступны ўезд у Польшчу на 3—5 гадоў.

Да экстрэмальных сітуацый, адзначыў М.Барысевіч, адносяцца таксама выпадкі захворвання і смерці грамадзян Беларусі. Пры гэтым прэс-сакратар падкрэсліў, што лячэнне або рэпатрыяцыя цела абыходзіцца беларускім грамадзянам, родным памерлых і загінуўшых у значную грашовую суму. МЗС Беларусі звяртае ўвагу, што ў мэтах пазбягання дадатковых выдаткаў пажадана афармляць пры выездзе за мяжу страхавы поліс.

Андрэй АСМАЛОЎСКІ, БелаПАН.

Народная Воля 19 ЖНІЎНЯ 1999 г.

Зеркало

На брифинге в Киеве

На брифинге в столице Украины кандидат в президенты страны, экс-премьер Евгений Марчук обвинил исполнительную власть в провокациях против соперников президента Кучмы по предвыборной кампании. По словам Евгения Марчука, его встреча с избирателями в Луганске в субботу была сорвана из-за ложного сообщения о заминировании зала, в котором было назначено собрание. Марчук обвинил милицию в бездеятельности, а местные власти — в запугивании граждан и блокировании предвыборных акций оппозиционных нынешнему президенту Кучме участников избирательной кампании.

Противоречивые сообщения о боях в Дагестане

В Дагестане российская армия продолжает операции против исламских боевиков, во главе которых стоит полевой командир Шамиль Басаев. Российские самолеты и вертолеты штурмовали несколько горных селений вблизи с границей Чечни. Велось также минирование дорог, ведущих в этот район. Тем временем МВД России заявил, что с начала боев убито более 400 исламских боевиков. Однако эти данные не имеют независимого подтверждения. По заявлению федеральных войск, потери с их стороны насчитывают за один день двое убитых и пятеро раненых. Однако только в Ростовский военный госпиталь вчера поступило 15 раненых, из которых четверо — тяжелораненых. Сами моджахеды утверждают, что со стороны российских войск в ночном бою с воскресенья на понедельник потери около 20 человек убитыми и двое попали в плен. Кроме того, сообщается о гибели четырех дагестанских ополченцев в результате ошибочного бомбометания российских ВВС.

Землетрясение в Турции

Поступают сообщения о мощном землетрясении в Турции. Оно произошло ночью в густонаселенном северо-западном районе страны между столицей Анкарой и Стамбулом. В поступивших оттуда сообщениях говорится о ряде жертв и большом числе раненых в результате разрушения жилых зданий. По телевидению показывали окровавленных людей в состоянии сильного шока. Множество людей покинули свои дома и остаются на улице, опасаясь дальнейших подземных толчков. Эпицентр землетрясения мощностью 6—7 баллов по шкале Рихтера находился в промышленном городе Измире. На измирском нефтеперерабатывающем заводе вспыхнул пожар. Во многих районах, включая Анкару, имели место перебои в энергоснабжении.

Как выйти замуж за француза

Парижский Гименей играет свадебный марш для украинских невест

«От качества ваших фотографий и вашего внешнего вида будет зависеть количество наших клиентов, которые заинтересуются вами... Желательно использовать облегающую одежду, подающую вашу фигуру с привлекательной стороны: короткие юбки, шорты, платья, в которых вы выглядите сексуально, привлекательно, будьте очень красивы, нарядны, раскованны и улыбайтесь...».

Это отрывок из письма парижского матримониального агентства «Ариест» примерно 1900 потенциальным украинским невестам, которые изъявили желание выйти по его каналам замуж за французов. Письмо сопровождается подробнейшей анкетой, в которой надо, помимо прочего, сообщить знак зодиака, отметить крестиком свое главное качество (романтичная, чувственная, веселая, собственница, щедрая, верная и т.д.), любимый отдых (телевизор, кино, культура, магазины). Соискательницы могут определить свои материальные запросы и назвать искомые черты характера избранника, известить, подходит ли им мужчина другого цвета кожи и какая возможна разница в возрасте (от 5 до 30 лет). Наконец, им предлагают дать «слово чести» в том, что их обращение в контору мотивировано исключительно благородным желанием создать интернациональную семью, а не низменными причинами типа получения французского гражданства при помощи фиктивного брака.

Мсье и мадам Галерм, владельцы агентства «Ариест», обосновавшегося рядом с парижской биржей, показывают мне альбомы фотографий украинских девушек и женщин от 18 до 55 лет, которые ищут любви и счастья во Франции. Действительно, фирма предлагает спутниц на все вкусы. Есть поразительно красивые юные создания, которые, наверное, могли бы неплохо смотреться в роли манекенщиц. Те же, кто не столь привлекателен и сексуален, имеют превосходные анкетные данные. Вопреки широко распространенному мнению, украинские, русские и другие бывшие советские гражданки любят свою Родину, пришел к заключению мсье Галерм, и хотят покинуть ее исключительно по причине непреодолимых материальных трудностей.

Радостно было слышать, что у славянок во Франции по-прежнему особая репутация — умны, привлекательны, добры и отзывчивы, замечательные жены, любящие детей и преданные семейному очагу, рассказывает мсье Галерм, 41 год, который занимается своим ремеслом больше 10 лет. Изначально он имел дело с польками, но со временем переключился на более перспективных украинок и в обозримом будущем намерен предложить свои услуги москвичкам и жительницам города на Неве. Напротив, к своим соотечественницам чета Галермов относится критически, утверждая, что эгоистические, холодные и равнодушные француженки до того доэмансипировались, что им мужчина больше вообще не нужен. Поэтому те французы, которые отчаялись найти себе родственную душу в своем отечестве, рванули в матримониальные конторы. Только в парижском, далеко не полном, телефонном справочнике я насчитал таких более 60. По всей видимости, во Франции их несколько сотен. Особняком стоит обширная сеть агентств, которая специализируется исключительно на славянском шарме.

Славянские женщины готовы куда угодно, хоть замуж за француза, хоть на сцену ночного клуба в Шри-Ланке.

Кто же эти французы, жаждущие связать свою судьбу с загадочными русско-украинско-белорусскими душами, проживающими на Украине? Наша мужская клиентура самая разнообразная, объясняет мне мсье Галерм. Это предприниматели, адвокаты, служащие и даже, случается, рабочие. (Безработные получают от ворот поворот). Примерно 60 процентов обращаются к услугам «Ариеста» в силу того, что не имеют времени самостоятельно заняться поиском подруги жизни, еще 20 процентов испытывают определенные психологические трудности в деле покорения женских сердец. Еще процентов 10 страдают от неизлечимой застенчивости. У Галермов есть свои принципы, которыми они, по их словам, никогда не поступаются. Так, например, они отказывают пожилым клиентам, которые ищут 18-летних. Для женщин установлен возрастной ценз в 55 лет, выше которого шансы найти себе француза равны нолю. Кроме того, у разведенной дамы не должно быть больше одного ребенка.

Как бы то ни было, с французской стороны в агентство обращаются в основном люди обеспеченные, случаются даже богатые, ибо поиск невесты не всякому по карману. Условия «Ариеста» такие: представительницы прекрасного пола, учитывая их безнадежное материальное положение, ничего агентству не платят и поджидают суженых дома. Француз, выбрав из каталога одну или нескольких кандидаток, отправляется на Украину, где в сопровождении местного уполномоченного «Ариеста» проводит в среднем от одной до двух недель. Одна такая поездка обходится примерно в 35 тысяч франков.

Сделав свой выбор, кавалер приглашает избранницу за его счет приехать во Францию, где окончательно решается вопрос «быть или не быть». Если «быть», то, урегулировав различные административные формальности, украинка перебирается во Францию, где регистрируют брак и играют свадьбу. Спрос велик, невесты многообещающие, от 50 до 65 процентов мужской клиентуры «Ариеста» находят себе пару. Эта цифра, полагает чета Галермов, могла бы быть еще больше, если бы не некоторые специфические черты славянского характера, а именно: уверенность в своей правоте, упрямство и даже порой чувство превосходства, основанное на более высокой общей культуре и образовании. Все расходы берет на себя мужчина, а женщина ровным счетом не платит ничего. Браки в подавляющем большинстве случаев, утверждает парижский Гименей, счастливые, а разводов буквально единицы. И незнание языка для молодоженов никогда не является непреодолимым барьером. Чем шире распахиваются границы, тем больше будет интернациональных браков.

Конечно, во Франции существуют разносортные матримониальные конторы, признает мсье Галерм. Среди них попадаются и такие, которые под знаком Гименея вербуют в жриц любви ничего не подозревающих девиц. Но все подобные агентства, включая «Ариест», находятся под бдительным надзором МВД, префектуры, контрразведки, бригады по борьбе с проституцией и даже фискальных служб.

Юрий КОВАЛЕНКО "Н.И." из Парижа

Проблема

Скушай яблочко! Белорусское

Неплохой выдался в этом году урожай на яблоки. Густо усыпаны ими ветки деревьев, с каждым днем все больше наливаются спелостью сочные плоды. А вот что будет осенью и зимой? Будем ли мы, как и в прошлые годы, довольствоваться несколькими сортами молдавских или польских яблок? Почему на прилавках магазинов зимой практически не бывает белорусских яблок?..

А ведь, как говорит генеральный директор Ассоциации "Белсадпитомник" Анатолий КОРЕНЬКО, "садоводческая отрасль может быть не доходно́й, а дохо́дной"

В шестидесятые годы сады выкорчевывали. Деревьев было много, тем более старых. Хранилищ не было, яблоки шли в основном на переработку. Считалось, что выгоднее выкорчевать яблони и выкормить на этом гектаре двух бычков. Да и система кооперации тогда не была готова.

В семидесятые годы по садоводческим товариществам развозили по дворам ящики со стружкой, опилками. Скупали яблоки у населения по мизерной цене — по 10—12 копеек за килограмм.

В восьмидесятые года начали закладывать сады нового поколения. Самые массовые посадки были в 1985—86 годах. Выходили на 3—4 тыс гектаров посадок в год. Но садоводческая отрасль продолжала оставаться кризисной. Начиная с 1990 года положение в садоводстве с каждым годом становилось все хуже и хуже. Не хватало не только финансирования, но и внимания со стороны государства.

Урожайность плодов была крайне низкой — 10-12 центнеров с гектара. Производство фруктов в 1991—1997 годах в Беларуси составляло в среднем 453 тысячи тонн. А это приблизительно 44 килограмма на одного жителя Беларуси, тогда как по медицинским нормам этот показатель должен составлять около 80 килограммов.

Ситуация усугубляется еще и тем, что большинству плодовых насаждений сейчас более тридцати лет. К тому же и многие сорта устарели. И поэтому белорусы ежегодно вынуждены импортировать плодово-ягодную продукцию на сумму от 10 до 15 миллионов долларов США.

* * *

Исходя из того, какое положение сложилось в садоводческой отрасли сложилось, в 1997 году Минсельхозпрод совместно с другими министерствами и ведомствами разработал и утвердил в правительстве республиканскую Программу развития плодоводства на 1997—2000 годы. А в рамках этой программы была создана республиканская ассоциация "Белсадпитомник". Мой собеседник — генеральный директор "Белсадопитомника" Анатолий КОРЕНЬКО.

— Суть создания "Белсадпитомника" — объединение усилий всех садоводов, практиков, ученых, всех, кто причастен к отрасли садоводства. Когда ассоциация создавалась, у нас было 17 членов-учередителей. На первом этапе мы занялись кадровыми вопросами. Провели учебу с аттестацией. Потом наладили выпуск на семи заводах специализированной садовой техники. Обеспечиваем хозяйства инструментом. И конечно же закладываем сады...

Сейчас в "Белсадпитомнике" насчитывается 68 субъектов хозяйствования, среди них — 4 института, опытная станция, две экспериментальные базы, совхозы, колхозы и 12 фермерских хозяйств. Этим хозяйствам, таким, как, например, СКП "Прогресс" и "Октябрь" Гродненского района, совхозу "Рассвет" Брестского района, Столинской агроферме имени Ленина, и многим другим, садоводческая отрасль плодоводства дает высокую прибыль. У них урожайность плодов составляет от 80 центнеров с гектара и выше и уровень рентабельности больше 100%.

— Анатолий Николаевич, я знаю, что при Вашем непосредственном участии было заложено 26 промышленных садов площадью 7,2 тысячи гектаров. Согласно Программе развития плодоводства до 2000 года, надо осуществить закладку 1,5 тысячи гектаров многолетних растений. Это много или мало?

— Очень мало. У нас садов высокого и среднего бонитета осталось очень мало — около 20 тысяч гектаров в общественном секторе. А мы должны ежегодно делать 10% садооборота от имеющегося, то есть закладывать 2 тысячи гектаров садов в год. А у нас запланировано 1,5 гектара до 2000 года. Я думаю, что этой зимой при поддержке правительства разработаем новую долгосрочную программу, как минимум, до 2010 года. Объемы по закладке насаждений будут пересмотрены. Я Вам авторитетно скажу, что если с 2001 года не будут более активно закладываться сады, мы можем прийти к очень печальным исходам.

— А этой зимой мы будем с яблоками? С белорусскими?

— Погодно-климатические условия в этом году нам здорово повредили. Я имею в виду весенние заморозки. При плане производства плодовых 312,3 тысячи тонн, у нас ожидается производство только 242 тысячи тонн.

В этом году неплохой урожай в Минской, Гродненской и Витебской области. А вот в Брестской — похуже, там сады были сильно повреждены во время заморозков. В Могилевской и Гомельской областях урожай также неважный...

— Анатолий Николаевич, Вы любите повторять, что садоводческая отрасль не доходна́я, а дохо́дная...

— Это сейчас сами видят руководители специализированных хозяйств "Белсадпитомника". Яблоки обычно убирают в начале сентября. Скажем, в этом году первоначальная стоимость их — приблизительно 150 тысяч, а перед Новым годом их цена возрастет в 2-3 раза. А если продавать яблочный сок — итого больше, до 800 тысяч...Разница ощутимая.

— Вы посоветуете белорусам покупать красивые, без пятнышка, импортные яблоки?

— В Польше, чтобы вырастить красивые гладкие яблоки, садоводы проводят до 15—20 химобработок. И порой это небезопасно для здоровья. В XXI веке в садоводстве будет доминировать агроэкологическое направление. А это значит — минимум обработок. У нас есть сорта-иммунники, аборигены, устойчивые к ряду болезней. Это такие сорта, как "Имрус", "Чистотел" и другие. Для них достаточно одной, двух обработок, а то и ни одной. Это очень важно, особенно для послечернобыльской Беларуси.

— А как обстоят дела с посадочным материалом?

— У нас более 35 питомников во всех областях Беларуси, причем с наиболее подходящим для местных условий ассортиментом. В прошлом году в питомниках было выращено 388 тысяч плодовых. За два года мы создали базу по закладке маточных насаждений. В прошлом году заложили около 120 гектаров маточников, примерно в 4—5 раз больше обычных площадей. Значительно расширили ассортимент — больше стало саженцев груш, вишни, алычи.

На создание материально-технической базы питомников за два года было направлено около 100 миллиардов рублей. Сейчас прорабатывается вопрос по кредиту. Но нас закрепили почему-то к коммерческому банку "Развитие". А я считаю, что именно Национальный банк должен открыть нам долгосрочную кредитную линию под небольшой процент сроком на 5 лет через систему "Белагропромбанка". А кредиты под 93 процента, которые дает банк "Развитие", никто брать не будет.

* * *

В Беларуси более 30 сортов яблок, среди них 15 — уникальные. Раньше самыми распространенными у нас были "Антоновка", "Штрейфлинг", "Пепин шафранный", "Суслепское" и другие. Более современные — это "Коваленковское", "Антей", "Заславское", "Алеся" и другие, особенно "иммуники".

В хорошо нам известном яблоке содержится много витаминов, углеводов, пектинов, которые для белорусов особенно полезны, поскольку они выводят радионуклиды из организма человека. Анатолий Коренько советует каждому человеку в день съедать в среднем хотя бы два яблока и выпивать стакан сока.

Этим летом на прилавках магазинов уже можно увидеть белорусские яблоки нового урожая. Хотелось бы, чтобы и зимой, купив в магазине яблоко, можно было дать его ребенку и сказать: "Скушай яблочко. Наливное, белорусское...".

Анна СОУСЬ.

Эвакуация сербов из Косово

Агентство ООН по делам беженцев объявило, что вывозит из деревень и городов Косово сербов, безопасность которых находится под угрозой. Это происходит, несмотря на возражения со стороны международных миротворческих сил под руководством НАТО. Представитель агентства сказал, что его сотрудники перевезли в безопасные места несколько сот сербов, однако операция по их вывозу может быть расширена из-за растущей угрозы со стороны албанских боевиков. Представитель сил К-ФОР заявил, что миротворцы возражают против действий работников ООН и не будут помогать эвакуации сербов. Однако представители агентства ООН указали на несколько случаев, в которых миротворцы НАТО помогли вывезти сербов в безопасное место. Тот факт, что агентство ООН занимается эвакуацией сербов, может рассматриваться как признак провала усилий международного сообщества.

Япония заверила Россию

Япония заверила Россию в том, что намерения Токио и Вашингтона ввести в действие новую систему противоракетной обороны в тихоокеанском регионе не продиктованы агрессивными намерениями. Соглашение о разработке системы последовало за прошлогодними испытаниями баллистической ракеты в Северной Корее. Россия выразила свою озабоченность этими планами во время визита в Москву руководителя Национального оборонного агентства Японии Хосея Нороты. Однако японские официальные лица сообщили, что в ходе переговоров с министром обороны России Сергеевым Норота подчеркнул, что соглашение с США носит исключительно оборонительный характер.

А.Лукашэнка мае намер сесці за стол перамоў толькі з тымі прадстаўнікамі апазіцыі, хто "канструктыўна крытыкуе ўладу"

"Я не веру ні адной партыі, ні аднаму руху, за выключэннем тых людзей, якія канструктыўна крытыкуюць уладу". Аб гэтым заявіў Аляксандр Лукашэнка на адкрыцці Мінскай ЦЭЦ-5, каменціруючы маючыя адбыцца палітычныя кансультацыі ўлад з апазіцыяй.

Напярэдадні гэтай падзеі шэраг буйнейшых апазіцыйных партый прыняў рашэнне аб дэлегаванні сваіх паўнамоцтваў на маючых адбыцца перамовах з уладамі Вярхоўнаму Савету 13-га склікання. Гаворачы пра гэта, А.Лукашэнка адзначыў: "Гэтыя спадары, якія нічога сабой не ўяўляюць, спрабуюць выкарыстаць хоць нейкую структурку, — гнілую, паўгнілую, — для таго, каб неяк сябе паказаць, рэалізаваць або выкарыстаць як зброю для сваіх карысных мэтаў, для таго, каб наладжваць цыркацкую рознага роду клаунаду. А сёння не крытыка патрэбная. Сёння патрэбны канкрэтныя дзеянні. Вазьміце што-небудзь і зрабіце".

"Я вам павінен сказаць, што там апазіцыі няма як такой, — заявіў Лукашэнка. — Галоўка палітычная, калі можна так назваць, сканцэнтравана ў трыццаці гэтых дэпутатах, якія засталіся, вось гэтае шмаццё ад старога Вярхоўнага Савета. Але мы не збіраемся ствараць ім аўтарытэт і садзіцца з імі за адзін стол. Я ўжо сказаў, што я ўжо сядзеў і з пазнякамі, і з ганчарамі, і з шарэцкімі за адным сталом. Гэта ж было на вашых вачах... Калі яны хочуць дабра нашай краіне, дык ім трэба не бегчы за мяжу, а дабро рабіць дома.

Трэба на працу перш за ўсё ўладкавацца, а не хадзіць... Бамжатнік развялі гэты там і называюць яшчэ Вярхоўным Саветам".

БелаПАН.

P.S.: *Аляксандр Лукашэнка за стол перамоў з апазіцыяй яшчэ ні разу не садзіўся.*

Паводле слоў Міхаіла Сазонава, перамовы апазіцыі і ўлад з удзелам АБСЕ пачнуцца ўжо на наступным тыдні

Першыя кансультацыі прадстаўнікоў апазіцыі і ўлад пры пасрэдніцтве АБСЕ пройдуць на будучым тыдні.

Пра гэта заявіў у інтэрв'ю Беларускаму тэлебачанню памочнік Лукашэнкі Міхаіл Сазонаў. Ён, як вядома, па распараджэнні А.Лукашэнкі ўзначаліў рабочую групу для правядзення такіх кансультацый.

Нагадаем, што значныя намаганні для арганізацыі перамоў паміж уладамі Беларусі і апазіцыяй, якія закліканыя вырашыць унутрыпалітычны крызіс у краіне, прыкладваюць еўрапейскія міжнародныя арганізацыі — перш за ўсё АБСЕ.

Сазонаў лічыць, што да гэтых перамоў "неабходна прыцягнуць увесь спектр грамадскіх сіл, якія будуць удзельнічаць у выбарах у 2000 годзе". Паводле яго слоў, беларускія ўлады ўскладаюць надзеі на актыўнае пасрэдніцтва ў перамовах рабочай групы Парламенцкай Асамблеі АБСЕ і Кансультацыйна-назіральнай групы АБСЕ ў Беларусі. Пры гэтым ён адзначыў, што кіраўнік КНГ Ханс-Георг Вік карыстаецца "павагай як сярод беларускага грамадства, гэтак і ва ўладных структурах".

"Часта выказваюцца пэўныя сумненні, маўляў, што б мы ні рабілі ў Беларусі адносна вядзення дыялогу з апазіцыяй, лібералізацыі дэмакратычных пераўтварэнняў, лібералізацыі нашай выбарчай сістэмы, гэта не будзе прынята на Захадзе, — сказаў Сазонаў. — Але мне здаецца, што гэта не так. Якраз на Захадзе з разуменнем ставяцца і, напэўна, успрымуць імкненні беларускіх улад у гэтым накірунку. Мне здаецца, галоўная задача зараз — знайсці прымальнае рашэнне і правесці парламенцкія выбары 2000 года на дэмакратычнай аснове".

Дэпутат Вярхоўнага Савета Беларусі 13-га склікання А.Лябедзька лічыць, што палітычны дыялог паміж апазіцыяй і выканаўчымі ўладамі можа пачацца толькі ў верасні

Паводле слоў старшыні Камісіі Вярхоўнага Савета Беларусі 13-га склікання па міжнародных справах Анатоля Лябедзькі, палітычны дыялог паміж апазіцыяй і выканаўчымі ўладамі можа пачацца толькі ў верасні. Такое меркаванне ён выказаў 16 жніўня падчас сустрэчы з журналістамі.

Нагадаем, што 13 жніўня ў інтэрв'ю Беларускаму тэлебачанню Міхаіл Сазонаў заявіў аб тым, што першыя кансультацыі з прадстаўнікамі апазіцыі пройдуць ужо на гэтым тыдні. На думку А.Лябедзькі, гэта немагчыма з-за таго, што Вярхоўны Савет, якому шэраг апазіцыйных палітычных партый дэлегавалі паўнамоцтвы на вядзенне дыялогу, яшчэ не вызначыўся са складам дэлегацыі. Чакаецца, што гэта будзе зроблена на пазачарговай сесіі ВС, запланаванай напрыканцы жніўня — пачатку верасня. "Дагэтуль, пакуль на сесіі ВС не будзе зацверджаны склад "шасцёркі" з боку апазіцыі, наогул пра нейкія двухбаковыя кансультацыі, дыялог або перамоўны працэс гаварыць не даводзіцца", — сказаў А.Лябедзька. На ягоную думку, у бліжэйшы час у прэсе будуць толькі агучаныя асноўныя прынцыпы і падыходы да маючага адбыцца дыялогу з боку ВС і выканаўчых улад.

Адначасова дэпутат як "пазітыўны факт" адзначыў стварэнне рабочай групы, якая будзе прадстаўляць на перамовах уладныя структуры. Пры гэтым, паводле слоў А.Лябедзькі, для апазіцыі зусім не важны склад гэтай групы, паколькі яна будзе проста "агучваць" пазіцыю Лукашэнкі.

Юрый ПАЦЁМКІН.

Міністэрства юстыцыі адмовіла ў перарэгістрацыі Беларускай асацыяцыі маладых палітыкаў

Як стала вядома БелаПАН, Міністэрства юстыцыі адмовіла ў перарэгістрацыі Беларускай асацыяцыі маладых палітыкаў (БАМП).

16 жніўня падчас сустрэчы з журналістамі кіраўнік БАМП, старшыня камісіі Вярхоўнага Савета 13-га склікання па міжнародных справах Анатоль Лябедзька абверг усе заўвагі Мінюста, накіраваныя ў адрас БАМП. Праўда, пры гэтым ён адзначыў, што падобнае рашэнне рэгіструючага органа не было для асацыяцыі нечаканым. "На нашу думку, — сказаў ён, — зараз наогул дадзена адмашка для палітычнай зачысткі так званага "трэцяга сектару". З другога боку, як адзначыў дэпутат, на пачатковай стадыі падрыхтоўкі дакументаў БАМП імкнуўся выканаць "літаральна да коскі" усе патрабаванні Мінюста і спадзяваўся на станоўчы вынік.

А.Лябедзька лічыць, што адмова ў перарэгістрацыі ўзначальваемай ім арганізацыі непасрэдна звязана з ягонай палітычнай дзейнасцю. У сувязі з гэтым кіраўнік БАМП лічыць, што такі ж лёс напаткае і іншыя палітычныя арганізацыі, да стварэння якіх ён таксама мае дачыненне, у прыватнасці — Беларускую еўраатлантычную асацыяцыю. Разам з тым А.Лябедзька запэўніў прадстаўнікоў СМІ ў тым, што асацыяцыя будзе і надалей ажыццяўляць дзейнасць, магчыма, нават "на паўлегальным" або "нелегальным" становішчы.

